**Такое не забываецца**

27 студзеня – Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту. Ён аб'яўлены рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН ад 1 лістапада 2005 года. Дата 27 студзеня выбрана невыпадкова: у гэты дзень савецкія войскі вызвалілі канцэнтрацыйны лагер Асвенцым.

На гэты раз 27 студзеня да нас у школьны музей баявой і працоўнай славы завіталі друга-класнікі. На даступнай мове з улікам іх узросту мы пагутарылі пра пачатак вайны, разабралі такія паняцці, як Халакост, генацыд. Даведаліся дзеці і пра гета, масавыя расстрэлы яўрэяў у Паставах, Дунілавічах, Лынтупах, брацкія магілы і абеліскі на месцы знішчэння няшчасных людзей. Свой расказ я суправаджала фотаздымкамі, якія ёсць па гэтай тэме ў нашым музеі. Вядома, што з Пастаўскіх яўрэяў у жывых застаўся толькі Гендэль Шнеер Рахмелевіч, 1924 года нараджэння. У дзень трагедыі, 21 лістапада 1942 года, яму было ўсяго 17.

Лёс яўрэйскага народа быў прадвырашаны гітлераўцамі. Мясцовыя жыхары, шчыра шкадуючы гэтых людзей, нярэдка спрабавалі ўратаваць іх ад смерці, хоць і ведалі, чым для іх гэта можа скончыцца: за ўтойванне яўрэяў немцы жорстка расстрэльвалі ўсіх. Тым не менш маміна бабуля (мая прапрабабуля) Ганна Чэрашкявічэне, як расказвала мне мама, неяк выратавала ад смерці яўрэйскага мужчыну. На жаль, яго імя я не запомніла, хоць мама і называла.

Памятаю, як у дзяцінстве пра яўрэяўчула ад мамы не раз, што гэта былі вельмі таленавітыя і працавітыя людзі. Мясцовыя жыхары сябравалі з імі, раслі, гулялі, разам хадзілі ў школу. У мамінымм літоўскім мястэчку Іонішкіс (Літва з 1940 года ўвайшла ў склад СССР) пражывала іх шмат. У адной з яўрэйскіх дзяўчат, па словах мамы, былі вельмі прыгожыя, доўгія чорныя кучаравыя валасы...

Пачалася вайна. Аднойчы мая мама (тады яшчэ маладая дзяўчына) пайшла ў поле, каб падаіць і перавязаць карову. Неўзабаве заўважыла ўдалечыні групу людзей. Раптам раздаліся стрэлы. Спалохаўшыся, мама лягла на зямлю і баялася паварушыцца. Калі ўсё сціхла, вярталася да дому. Непадалёк заўважыла свежазасыпаны вялікі роў. Тое, што тут былі знішчаны мясцовыя яўрэі, зразумела, калі ўбачыла прысыпаныя пяском доўгія чорныя кучаравыя валасы... Смерць нявінных ахвяр аплаквалі тады ўсе жыхары мястэчка.

Гэтыя жудасныя факты маленькія наведвальнікі музея слухалі ўважліва. Яны пачулі тое, пра што раней не ведалі. На іх тварах чытаўся жах, боль. Немагчыма застацца раўнадушнымі да таго гора, якое напаткала людзей у вайну. І хочацца, каб гэта ніколі не паўтарылася, каб на зямлі заўсёды быў мір!

Рэгіна Ластоўская, кіраўнік музея баявой і працоўнай славы ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Паставы імя Н.М.Асяненкі”